**Форум.** VII Форум бібліятэкараў краіны «Бібліятэка, чытанне і кніга як інструмент грамадзянскага выхавання і захавання духоўных каштоўнасцей» прайшоў у Нацыянальнай бібліятэцы. Арганізатарамі мерапрыемства выступілі Міністэрства культуры, Беларуская бібліятэчная асацыяцыя, Фундаментальная бібліятэка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і галоўная кніжніца краіны. Сярод тэм, што абмяркоўваліся, — «Бібліятэкі ва ўмовах лічбавізацыі», «Практыкі работы бібліятэк з дзецьмі і моладдзю», «Бібліятэчная адукацыя і прафесійнае развіццё бібліятэкараў», «Міжведамаснае ўзаемадзеянне бібліятэк, шматфункцыянальнасць і разнастайнасць форм работы».